КРАЯЗНАЎЧАЕ ТАВАРЫСТВА “МАЛОЕ ПАЛЕССЕ”

# ГІСТОРЫЯ

## *Друцка-Бярэзінскага краю*

Матэрыялы Першых грамадскіх
навукова-краязнаўчых чытанняў

*Мінск-Крупкі-Магілеў*
*28 сакавіка, 17 траўня, 20 чэрвеня 2015 г.*

Мінск-Крупкі

2015

УДК 94(476)(06)+908(476)(06)

ББК 63.3(4Беи)

И 90

Укладальнік:

*А.П. Аляхновіч*

Рэдакцыйная калегія:

*В.І. Шадыра,* старшы навуковы супрацоўнік
ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі",
кандыдат гістарычных навук, дацэнт (навуковы рэдактар),

*В.В. Урублеўскі,* галоўны архівіст аддзела публікацыі дакументаў
ДУ "Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ)",
кандыдат гістарычных навук (Мінск),

*Ю.М. Снапкоўскі,* галоўны архівіст аддзела публікацыі дакументаў
ДУ "Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ)",

*А.П. Аляхновіч,* даследчык гісторыі, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў.

**Гісторыя Друцка-Бярэзінскага краю**, матэрыялы Першых грамадскіх навукова-краязнаўчых чытанняў, Мінск-Крупкі-Магілеў, 28 сакавіка - 20 чэрвеня 2015 г./ укладальнік: А.П. Аляхновіч. – Мінск, 2015. – 310 с.

ISBN

Зборнік змяшчае матэрыялы Першых грамадскіх навукова-краязнаўчых чытанняў "Гісторыя Друцка-Бярэзінскага краю", якія праходзілі ў Мінску, Крупках і Магілеве 28 сакавіка, 17 траўня і 20 чэрвеня 2015 г. Публікуюцца даклады навукоўцаў і краязнаўцаў, прысвечаныя розным старонкам гісторыі і культуры рэгіёна Малога Палесся (Друцка-Бярэзінскага краю). Матэрыялы зборніка будуць карыснымі даследчыкам, настаўнікам і ўсім зацікаўленым роднай гісторыяй.

УДК 94(476)(06)+908(476)(06)
ББК 63.3(4Беи)

ISBN

© Краязнаўчае таварыства "Малое Палессе", 2015

**Юрый Снапкоўскі, (Мінск)**

# У ПОШУКАХ "ВЕЧНАЧЫНШАВЫХ ПРАВОЎ".

## *Беззямельныя шляхціцы Крупшчыны і Барысаўшчыны ў другой палове XIX – пачатку XX стст.: сацыяльныя метамарфозы ў святле архіўных дакументаў*

"Дворяне в губерниях западных суть те, кои имеют поместья, или служив, получили чины, но шляхта есть тот сброд людей, который доискивается дворянства, не имея на то ни права, ни документов, шатается без занятий, или находится в услужении и составляет класс самый вредный и развратный"

*Расійскі імператар Мікалай I,*
*1831 г. [8, с. 63]*

"Сумна цяпер глядзець на былых нашчадкаў тых магутных, свабодных, авеяных славаю шляхціцаў-рыцараў, сумна бачыць іх цяперашні інтэлектуальны ўзровень, сумна прызнаваць маральны ўпадак дробнай шляхты, якая пасля колішняга ўзвышэння трапіла ў поўную залежнасць ад магнатаў – сваіх братоў паводле канстытуцыі, але ў сапраўднасці сваіх паноў"

*Уладзіслаў Сыракомля,*
*"Вандроўкі па маіх былых ваколіцах", 1853 г. [43, с. 23–24]*

З часоў Рэчы Паспалітай на лясных прасторах Барысаўскага староства, у межах сучасных Барысаўскага і Крупскага раёнаў, раскінулася сетка пасяленняў дробнай "польскай шляхты" – паланізаваных прадстаўнікоў беларускай знаці. Пераважная большасць іх не мела ўласнай зямлі, трымала зямельныя надзелы на ўмовах бестэрміновай спадчыннай арэнды, але ў прававых адносінах была роўнай з усімі астатнімі шляхецкімі коламі. Менавіта гэтай катэгорыі шляхецтва, якая ў канцы XVIII ст. была інкарпаравана ў сацыяльна-прававы кантэкст расійскай гісторыі і больш за стагоддзе адчайна змагалася за свой сціплы кавалачак шчасця пад сонцам на абшарах Друцка-Бярэзінскага краю, прысвечана дадзеная публікацыя.

За палову стагоддзя пасля канчатковага далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі шляхецкае насельніцтва вымушана было перажыць націск усемагчымых абмежаванняў і рэпрэсіўных мер з боку новых улад – русіфікацыі, "праваславізацыі", пазбаўлення шэрагу старых прывілеяў, палітычнага ўплыву, уніжальнай працэдуры доказу шляхецкага паходжання і, у самым горшым выпадку, залічэння ў падатны стан [42, с. 108–115]. Усё гэта разам з агульнаімперскімі сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі працэсамі другой паловы XIX – пачатку XX стст., у выніку, прывяло да таго, што шляхта, па слушнай заўвазе гісторыка Аляксандра Сяліцкага, "фактычна перастае быць адзіным саслоўем, ператвараецца ў кангламерат розных сацыяльных груп, якія вельмі істотна адрозніваліся адзін ад аднаго па сваійму становішчу і інтарэсам" [42, с. 127–128].




*Фота 1. Справа Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні роду Бабіцкіх герба "Даленга" (НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 82).*




*Фота 4. Рэестр збору чыншу па Барысаўскім старостве за 1754 г. (НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 2. – Спр. 510).*

Беззямельная, ці "шарачковая", шляхта, а менавіта – чыншавая, якая бестэрмінова арандавала зямлю ў буйных землеўладальнікаў і сама яе апрацоўвала, складала пераважную большасць умоўна адзінага шляхецкага саслоўя і прайшла пад скіпетрам расійскага цара, бадай, найбольш шматпакутлівы і супярэчлівы шлях. У выніку імперскай палітыкі "разбору шляхты" 1830–1860-х гг. адна частка чыншавікоў была зацверджана Сенатам у складзе расійскага дваранства, а другая, якая так і не змагла даказаць свайго шляхецкага паходжання, фармальна была прыпісана да мяшчан ці нават да сялянскіх таварыстваў. У нашым выпадку, адны шляхціцы-чыншавікі радзівілаўскага маёнтка Барысаўшчына (былога Барысаўскага староства) афіцыйна сталі дваранамі Барысаўскага павета *(фота 1)*, другія апынуліся ў складзе мяшчан горада Барысава ці мястэчка Халапенічы, але па-ранейшаму працягвалі пражываць у сельскай мясцовасці. Іх лёс і становішча, у значнай ступені, прадвызначылі тыя абставіны, што ў 1857 г. князь Леан Радзівіл свой маёнтак Барысаўшчына, які яшчэ ў 1797 г. быў падараваны яго дзеду князю Міхаілу Радзівілу *(фота 2)* імператарам Паўлам І, прадаў вялікаму князю Мікалаю Мікалаевічу Старэйшаму *(фота 3)* з царскага дому Раманавых [35], а ў 1876 г. гэты маёнтак, ужо пад назвай "Стары Барысаў" ("Стара-Барысаўскі маёнтак"), быў набыты Міністэрствам дзяржаўных маёмасцяў



*Фота 2. Князь Міхаіл Геранім Радзівіл (1788–1850), уладальнік маёнтка Барысаўшчына Барысаўскага павета Мінскай губерні з 1797 г.*



*Фота 3. Вялікі князь Мікалай Мікалаевіч Старэйшы (1831–1891), уладальнік маёнтка Барысаўшчына Барысаўскага павета Мінскай губерні з 1857 г.*

[17] і лічыўся казённым да 1899 г., калі зноў перайшоў ва ўласнасць вялікіх князёў Раманавых [16]. Таму ў дачыненні да чыншавых шляхціцаў Стара-Барысаўскага маёнтка ў час падрыхтоўкі і рэалізацыі чыншавай рэформы 1886 г., якія прыпаў менавіта на перыяд знаходжання маёнтка ў казённым валоданні, праводзіліся мерапрыемствы як да жыхароў дзяржаўных зямель, што, бадай, толькі ўскладняла іх становішча і яшчэ хутчэй набліжала іх да трагедыі абеззямельвання.

Вечначыншавыя адносіны, росквіт якіх у Беларусі прыпадае на XVII–XVIII стст., прадугледжвалі бестэрміновае ("вечнае") і спадчыннае карыстанне памешчыцкай зямлёй з фіксаванай грашовай платай за яе – чыншам (польск. *czynsz* ад ням. *Zins* – "працэнт"), прычым такія адносіны звычайна афармляліся на ўзроўні вусных пагадненняў з землеўладальнікамі *(фота 4)*. Беларускі гісторык Віталь Макарэвіч, вядомы спецыяліст па дробнай шляхце, вылучае два шляхі ўзнікнення вечначыншавых адносін – як за кошт запрашэння магнатамі ВКЛ на пасяленне ў сваіх уладаннях прадстаўнікоў свабоднага насельніцтва (шляхціцаў, сялян, выбранцаў, путных баяр, зямян і інш.), якія б вялі самастойную гаспадарку, але пры гэтым мелі гарантыі доўгатэрміновага карыстання зямлёй, так і за кошт службы шляхціцаў у магнацкім апалчэнні, калі шляхціц атрымліваў зямельны надзел ад магната пры ўмове выканання вайсковай павіннасці ці аплаты чыншу [11, с. 5]. І хаця пасля падзелаў Рэчы Паспалітай прывілеяванае становішча вечных чыншавікоў – пераважна дробных шляхціцаў у асноўнай сваёй масе – з кожным днём усё больш губляла мэтазгод-

насць і выгаду для памешчыкаў, якім прыходзілася лічыцца з новымі грамадска-палітычнымі і эканамічнымі ўмовамі, вечначыншавае права яшчэ на працягу паловы стагоддзя заставалася без якіх-небудзь кардынальных зменаў. Аднак пэўныя фармальна-бюракратычныя захады ўсё ж былі зроблены землеўладальнікамі. Апошнія, у прыватнасці, пачалі заключаць са сваімі чыншавікамі кантракты на вызначаны тэрмін, пра што сведчаць, напрыклад, “Пасямейныя спісы шляхты Барысаўскага павета” за 1802 г. і “Ведамасць аб чыншавай шляхце Мінскай губерні, якая ў Барысаўскім павеце на землях памешчыцкіх пражывае” за люты 1829 г., захаваныя ў архіўных фондах устаноў мясцовай дваранскай карпарацыі [32; 34]. Увядзенне падобнай кантрактнай сістэмы ў рэчаіснасці яшчэ не азначала згубленне чыншавікамі іх “вечных” правоў, ніхто, канешне, пакуль не збіраўся выганяць іх са спадчынных зямель. Нават калі ў крыніцах гаворка ідзе аб чыншавай шляхце як аб “шляхце, якая … пражывае на арандаваных землях” [31, арк. 59, 124 адв.], трэба ўлічваць тую акалічнасць, што тагачасны бюракратычны механізм далёка не заўсёды адчуваў прынцыповую розніцу паміж характарам чыншавага права і характарам арэнднага права, бо ў расійскім заканадаўстве, як слушна адзначае В. Макарэвіч, не існавала паняцця аб вечначыншавым праве [10, с. 68].

Пытанне ліквідацыі вечначыншавых адносін як ніколі набыло актуальнасць толькі пасля адмены прыгоннага права ў 1861 г. і падаўлення паўстання 1863–1864 гг., калі ва ўмовах развіцця капіталістычных адносін і аблажэння многіх памешчыцкіх гаспадарак кантрыбуцыямі ў землеўладальнікаў абвастрылася патрэба ў значных фінансавых сродках, якія яны прагнулі атрымаць шляхам увядзення арэнднай сістэмы з улікам рыначнага кошту на зямлю [11, с. 6]. “Памешчык, прыціснуты да сцяны, пажадаў атрымаць большыя падаткі з чыншавікоў”, – канстатавала сутнасць праблема сталічная польскамоўная газета “Kraj” [10, с. 67–68]. У адваротным выпадку, масы чыншавікоў для памешчыкаў фактычна пераўтвараліся ў непатрэбны баласт. Над чыншавікамі тады навісала пагроза высялення. Сучаснік тых падзей, вядомы польскі антраполаг Юліян Талька-Грынцэвіч на гэты конт узгадваў: “Будучы незадаволенымі невялікім чыншам, яны (памешчыкі. – Ю.С.) лічылі за лепшае павялічыць свае надзелы, выкідаючы са сваіх спрадвечных сядзіб чыншавікоў, лёс якіх цяпер быў горшы, чым сялян” [11, с. 7]. Пры гэтым адзначым, што агульная колькасць чыншавікоў ва ўсёй імперыі складала амаль паўмільёна чалавек [10, с. 67].

Аднак набываць рудыментарны характар вечначыншавыя адносіны пачалі не толькі ў вачах памешчыкаў. Урадавыя колы даўно ўжо імкнуліся вычленіць з сацыяльнай структуры заходніх рэгіёнаў Расійскай імперыі падобныя катэгорыі насельніцтва. Па-першае, чыншавыя ўладанні пачыналі ўсё больш ператварацца ў свайго рода парахавую бочку, якая ў любы момант магла выбухнуць чарговай хваляй канфліктаў паміж чыншавікамі і памешчыкамі, што нярэдка вылівалася ва ўзброеныя сутычкі чыншавікоў з дзяржаўнай паліцыяй і нават арміяй. Яскравыя прыклады такіх хваляванняў прыводзіць В. Макарэвіч [11, с. 4, 7, 12]. Па-другое, сама дзяржава з’яўлялася буйным землеўладальнікам і таксама ўтрымлівала на сваіх землях чыншавікоў. Як і памешчыкаў, дзяржаву прываблівалі больш выгадныя ўмовы арэнднай сістэмы, якая складала для казны значную крыніцу даходаў. У гэтым сэнсе ў дзяржавы на сваёй уласнай зямлі былі больш развязаныя рукі адносна

захадаў па пераводу чыншавікоў на арэнднае трыманне зямельных надзелаў. Дзяржаве не трэба было тут ужо лавіраваць паміж памешчыкамі і чыншавікамі, зводзячы канфлікт да мінімуму, бо яна сама з'яўлялался "памешчыкам" і добра ўсведамляла, што бедныя і непісьменныя беззямельныя шляхціцы хоць і лічуць сябе "вечнымі чыншавікамі", але ўсё ж не маюць моцы супрацьстаяць юрыдычнай усемагутнасці імперыі Раманавых. В. Макарэвіч у сваёй публікацыі, прысвечанай менавіта "панскаму разбору шляхты", сам факт правядзення ўладамі "асобных мерапрыемстваў" у дачыненні да чыншавай шляхты дзяржаўных зямель адзначае толькі на ўзроўні тэзісу і далей яго не развівае [11, с. 5]. Таму нам хацелася б разгледзіць менавіта гэты аспект чыншавай рэформы 1886 г. і праілюстраваць ход дзяржаўнай палітыкі адносна шляхціцаў-чыншавікоў казённага маёнтка Стары Барысаў на канкрэтных прыкладах з архіўных дакументаў, амаль яшчэ не ўведзеных у навуковы ўжытак. Асноўнай для нас крыніцай тут з'яўляюцца шматлікія чыншавыя справы Мінскай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці – вышэйшай для чыншавікоў мясцовай апеляцыйнай інстанцыі [20, арк. 17 адв.–21]. Менавіта да гэтых спраў пры разглядзе апеляцыйных скаргаў чыншавікоў падшывалася першапачатковае справаводства Барысаўскай павятовай па чыншавых справах прысутнасці, сам фонд якой не захаваўся.

Набыўшы ў 1876 г. Стара-Барысаўскі маёнтак, казна пачала рабіць першыя захады па прымусоваму, хоць яшчэ і не востра адчувальнаму, пераводу сваіх чыншавікоў на становішча часовых арандатараў, пра што сведчаць шматлікія арэндныя справы, якія захаваліся ў архіўным фондзе Мінскага ўпраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцяў [14, арк. 166 адв.–199 адв., 203 адв.–205 адв., 243 адв.–245]. Асноўным дакументам у кожнай такой справе з'яўляецца кантракт на тыпаграфскім бланке, заключаны ў 1878 г. паміж "Казенным Управлением имением Старо-Борисов" і карыстальнікам зямельнага надзела. Самым важным пунктам кантракта для дзяржавы як контрагента з'яўляўся пункт пад № 1, паводле якога яна аддавала хутарскі ўчастак зямлі "ў арэнднае трыманне" на строга вызначаны тэрмін (звычайна – на 12 год, напрыклад, з 1 ліпеня 1878 г. да 1 ліпеня 1890 г. [15, арк. 1]). У пункце № 3 прапісваўся грашовы памер гадавой арэнды, адну палову якой арандатар павінен быў аплаціць 1 кастрычніка, а другую – 1 сакавіка кожнага года. Далей ішоў пералік звыш 10 умоў арэнды, за невыкананне якой-небудзь з іх арандатар "вызваляўся ад трымання хутара адміністрацыйным парадкам". Акрамя кантракта, у арэндныя справы ўключаліся наступныя асноўныя дакументы: 1) "ведамасць аб казённым хутары", дзе пазначаліся імя, імя па бацьку, прозвішча арандатара, усе існуючыя пабудовы, дата заключэння кантракту і яго нумар; 2) "вопіс і ацэнка хутара", дзе пералічваліся і апісваліся збудаванні, адзначаўся стан пабудоў (новыя ці старыя), пазначаліся іх параметры ў аршынах і вызначаўся іх кошт; 3) "талоны квітанцый дзяржаўнага казначэйства" аб аплаце гадавой арэнды хутарскога надзела. Такім чынам, дзяржава з самага пачатку ўцягнула старабарысаўскіх чыншавікоў у сваю жорсткую сістэму рэгламентаванага землекарыстання.

Згаданыя арэндныя кантракты за 1878 г. сталі "першай ластаўкай" абеззямельвання, а дакладней – абмежаванага абеззямельвання чыншавікоў маёнтка Стары Барысаў, інспіраванага менавіта дзяржавай. Хаця самім чыншавікам усе гэтыя пісьмовыя дамовы з казённай адміністрацыяй напачатку маглі ўяўляцца толькі

фармальнымі працэдурамі – і яны спадзяваліся на “аўтаматычнае” прадленне арэнднага кантракту кожныя 12 год, нават не здагадваючыся, што ў мазгу юрыстаў Сената ўжо даўно наспявала чыншавая рэформа. Дзяржава, відаць, вырашыла дзейнічаць паступова і не рызыкавала рабіць рэзкага вырашэння чыншавага пытання, апасаючыся, у прыватнасці, масавых пратэстаў і выступленняў, якія і так ужо пракаціліся моцнай хваляй па заходніх рэгіёнах імперыі.

Казённая адміністрацыя Стара-Барысаўскага маёнтка добра ўсведамляла, што заключэнне ёю арэндных кантрактаў з чыншавікамі павінна, у пэўнай ступені, прадвызначыць лёс апошніх. Яе спадзяванні, у рэшце рэшт, апраўдаліся, бо пасля ўваходжання ў сілу “Положения о поземельном устройстве сельских вечных чиншевиков в губерниях западных и белорусских” ад 9 чэрвеня 1886 г. [7] гэтыя кантракты сталі для дзяржавы юрыдычнай падставай для таго, каб лічыць усіх асоб, што прэтэндавалі на “вечначыншавыя правы”, толькі часовымі арандатарамі, з якімі б можна было лёгка развітацца па сканчэнні тэрміну арэнды. Так, напрыклад, у чэрвені 1887 г. жыхары хутара Маласаі Лошніцкай воласці дваранін Сямён Яфімавіч Бабіцкі і мяшчане Мікалай Іванавіч Хадасевіч і Ілля Данілавіч Крачкоўскі накіравалі ў Барысаўскую павятовую па чыншавых справах прысутнасць калектыўнае прашэнне аб прызнанні іх у вечначыншавых правах, патлумачыўшы наступнае: *“С незапамятных десятков лет мы владеем земельными участками в дер. Молосаи Лошницкой волости. Участки эти принадлежали помещику князю Родзивилу, которому мы уплачивали за эти участки чинш в определенном раз навсегда размере. Он же, Радзивил, отдал нашим прародителям эти участки бесконтрактно в бессрочное владение и пользование. После того участки наши принадлежали Его Императорскому Высочеству великому князю Николаю Николаевичу Старшему. И при нем мы плотили чинш в прежнем же размере и роде. Но со времени отдачи имения Старо-Борисово в [казенное] управление нам выданы арендные контракты”* [1] [21, арк. 8]. Першапачатковая пастанова па іх прашэнні была ўскладзена на неадменнага члена павятовай прысутнасці М.П. Сушкевіча, які толькі ў студзені 1889 г. (праз паўтары гады!) выказаў меркаванне адмовіць прасіцелям, паколькі тыя “не прадставілі доказаў на вечначыншавае валоданне зямельнымі ўчасткамі” і “апошнія гады яны жылі па кантрактах, і плата мянялася” [21, арк. 10 адв.]. Пакуль справа разглядалася ў павятовай прысутнасці, восенню 1889 г. іх зямельныя ўчасткі на хутары Маласаі былі “здадзены казённым маёнткам з таргоў іншым асобам” [21, арк. 4 адв.]. У выніку, павятовая прысутнасць канчаткова адмовіла Бабіцкаму, Хадасевічу і Крачкоўскаму ў прызнанні за імі права на вечначыншавае валоданне зямлёй, спасылаючыся менавіта на “наяўнасць тэрміновых кантрактаў, па якіх прасіцелі арандавалі зямлю”, і ў дабавак да гэтага нават пазбавіла іх магчымасці “захаваць за сабой валоданне на працягу пяці год на былой аснове” [21, арк. 4–5]. Адпаведным чынам, толькі ў больш рэзкай форме, у ліпені 1887 г. выказваліся халапеніцкі мешчанін Іван Мацвеевіч Бабіцкі і селянін Венядыкт Міхайлавіч Суднік, дбаючы аб атрыманні вечначыншавых правоў на зямельныя ўчасткі ў засценку Восаў-Нацкі Лошніцкай воласці: “*...мы уже арендуем по приказанию до 10 лет каждый и платежи вносим по назначению.*

[1] Тут і далей у вытрымках з архіўных крыніц захоўваецца арфаграфія арыгінала. – *Рэд.*

*<…> имение это как перешло в казенное ведомство, требуется от нас заключение срочных контрактов на аренду с возвышением арендной платы, тогда как на чиншевых правах этого не допускается"* [24, 5 адв.–6]. А вось як тлумачылі губернскай па сялянскіх справах прысутнасці сваё становішча часовых арандатараў жыхары хутара Крыштопаўшчына Лошніцкай воласці дваране Фелікс і Вікенцій Міхайлавічы Марцінкевічы і селянін Даменік Іванавіч Марцінкевіч: *"…что же касается имеемых срочных договоров, то это лишь потому, что нас заставили их брать недавно, но по всем книгам и инвентарам значится, что пользование наше с давних времен было чиншевое, каковые сведения уездное присутствие вовсе не требовало из архивы по им[ению] Старо-Борисов"* [29, арк. 2–2 адв.].

Многія "землеарандатары" Стара-Барысаўскага маёнтка былі ўпэўнены ў тым, што яны – "вечныя чыншавікі", і ў большасці выпадкаў намаганні іх былі справядлівыя, але юрыдычна бяздоказныя. Расійскае заканадаўства працавала ўжо далёка не на іх карысць, і артыкулы "Положения" ад 9 чэрвеня 1886 г. былі прадуманы і сфармуляваны такім чынам, што не пакідалі асноўнай масе чыншавікоў амаль ніякіх зачэпак. Звяртаюць на сябе ўвагу, у прыватнасці, 7-мы і 8-мы артыкулы, дзе абрысоўваецца кола разнастайных пісьмовых дакументаў, якія можна падаваць у якасці доказаў вечначыншавага валодання: устаноўчыя граматы, прывілеі, падараванні, дагаворы, кантракты, судовыя пастановы, справаводныя дакументы прысутных месцаў, уступачныя пагадненні, тастаменты, плацежныя кніжкі і квіткі аб узносе чыншавых плацяжоў, эканамічныя інвентары, грунтавыя кнігі, рэестры, вопісы, рэвізскія сказкі і інш. [7, с. 277]. У той жа час расійскія заканатворцы добра разумелі, што ніякіх пісьмовых дакументаў большасць чыншавікоў будзе не ў стане прадставіць, бо, па-першае, сам характар вечначыншавага права спрадвек прадугледжваў заключэнне дагавароў пераважна ў вуснай форме, а па-другое, калі хтосьці з чыншавікоў і меў якія-небудзь дакументы, то павінен быў, хутчэй за ўсё, іх проста страціць да гэтага часу. Так, згаданыя вышэй жыхары засценка Восаў-Нацкі Іван Мацвеевіч Бабіцкі і Венядыкт Міхайлавіч Суднік вымушаны былі патлумачыць павятовай па чыншавых справах прысутнасці наступнае: *"От непамятных времен предки наши, т.е. праотцы, деды и родители наши, владели на правах чиншевых из общей массы имения Радзивиллова землями по две уволоки, земли на правах чиншевых, и предположенные чиншевые деньги вносили в экономии имения Радзивилова князя Льва Радзивиллы, которые и вносились в экономические реестры, и [о] взносе чинша выдавались росписки, но таковые не избережены, а когда имение это перешло во владение великого князя Николая Николаевича Старшего, тогда <…> управляющий Шмид поотнимал платежные чиншевые книжки…"* [24, 5–5 адв.].

Разам з тым, ужо самы першы артыкул "Положения", дзе ў якасці галоўнага крытэрыя вечнага чыншавіка абвяшчалася "бестэрміновае карыстанне" зямельным участкам [7, с. 276], па сутнасці выкараняў усе дамаганні чыншавікоў нават пры наяўнасці ў іх дакументальных доказаў. Яшчэ ўчора адносна бяскрыўдныя арэндныя кантракты, да заключэння якіх вотчыннікі хітрасцю ці прымусам схілілі многіх сваіх чыншавікоў, сёння ўсе спадзяванні апошніх нечакана і бязлітаснаператваралі ў хімеру, і чыноўнікаў спехам створаных "павятовых па чыншавых справах прысутнасцяў" ніякія дакументальныя доказы чыншавікоў тут ужо не цікавілі. Яскравым таму прыкладам з'яўляюцца тыя чыншавыя (апеляцыйныя)

справы архіўнага фонду Мінскай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці, якія ўтрымліваюць адзінкавыя дакументальныя пасведчанні аб "вечным" праве чыншавікоў. Так, у лютым 1891 г. згаданы намі жыхар хутара Маласаі барысаўскі мешчанін Ілля Данілавіч Крачкоўскі, на падставе 35-га артыкула "Положения", падаў скаргу на пастанову павятовай па чыншавых справах прысутнасці, падкрэсліваючы прававую моц двух прадстаўленых ім дакументаў – польскамоўнага квітка аб выплаце чыншу ў 1850 і 1852 гг. (яшчэ пры знаходжанні маёнтка Стары Барысаў ва ўласнасці князёў Радзівілаў) [21, арк. 12–12 адв.] і бестэрміновай разліковай кніжкі, выдадзенай яму ў 1857 г. (ужо пры новых уладальніках – вялікіх князях Раманавых), на тытульным аркушы якой пазначана, што за трыманне плаца і 3/4 увалокі зямлі ён штогод павінен плаціць чынш у памеры 19 руб. 29 кап. [21, арк. 14]. *"А потому,* – адчайна пісаў Крачкоўскі, – *осмеливаюсь всепокорнейше просить губернское присутствие потребовать из Борисовского уездного по чиншевым делам присутствия подлинные расписки и расчетную книжку и, рассмотрев обстоятельство дела, войти в наше положение, что мы прожили 40 лет на участке земли, а ныне отобрали его у нас и оставили без земли и куска хлеба, почему постановление Борисовского уездного по чиншевым делам присутствия отменить, а постановить нам право на основании VIII ст[атьи] Высочайше утвержденного [мнения] Государственного Совета 9 июля 1886 года пользоваться чиншевым правом вечного владения на земельные участки, находящиеся в дер. Малосаях Лошничской волости казенного имения Староборисов"* [21, арк. 2 адв.–3]. "Абставіны справы" губернская прысутнасць, канешне, разгледзіла, ды толькі не на карысць Крачкоўскага, бо плацежны квіток за 1850-я гг., які сведчыць толькі "пра даўнасць карыстання зямлёй", і разліковая кніжка, дзе плата за зямлю называецца "чыншам", яшчэ не служаць "доказам таго, што само карыстанне адбывалася на вечначыншавым праве" [21, арк. 4 адв.]. У аднасяльчан жа Крачкоўскага – Бабіцкага і Хадасевіча – ніякіх пісьмовых доказаў увогуле не было, і таму яны маглі спасылацца толькі на саму "працягласць валодання зямлёй", але і яна, па тлумачэнні павятовай прысутнасці, "не з'яўляецца натуральнай уласцівасцю чыншавага права" [21, арк. 4 адв.–5].

Іншы прасіцель, жыхар хутара Царскія Вараты Зачысцкай воласці дваранін Аўгустын Якаўлевіч Бабіцкі, у павятовую па чыншавых справах прысутнасць пісаў: *"Хотя я ныне проживаю на казенной земле по срочному договору более 20 лет, но так как раньше, т.е. до перехода в хут. Царские Ворота, отец мой, даже дед и прадед проживали в д. Новоселках Лошницкой волости, где пользовались участками земли с непамятных времен без всякого договора, а лишь только на чиншевых правах, и у меня имеется даже все старые квитки, из которых видно уплата мною чинша"* [28, арк. 8]. Аднак прадстаўленыя Бабіцкім сем распісак аб уплаце чынша за 1830–1840-я гг. [28, арк. 11–17] і тут наўрад ці маглі што змяніць, бо ў іх фігуравала былое месца жыхарства прасіцеля і яго продкаў – вёска Навасёлкі, а "ўчасткам зямлі на хут. Царскія Вараты ён карыстаецца на праве тэрміновай арэнды па кантракце, значыць, дамаганне аб прызнанні яго чыншавіком, ці бестэрміновым арандатарам, не падлягае задавальненню" [28, арк. 23]. Прадстаўленыя ў павятовую прысутнасць жыхарамі хутара Крыштопаўшчына Марцінкевічамі яшчэ больш старыя чыншавыя квіткі за 1820-я гг. разам з разліковай кніжкай за 1857 г. таксама не прывялі да жаданага выніку [29, арк. 15–26, 29 адв.–30]. Не ўразілі членаў павятовай прысутнасці




*Фота 5. Чыншавая кніжка Адама Данілавіча Крачкоўскага з хутара Млёхава Барысаўскага павета ад 1 ліпеня 1857 г. /фрагмент/ (НГАБ. – Ф. 242. – Воп. 4. – Спр. 215. – Арк. 91–99 адв.).*

сваёй стогадовай даўніной нават польскамоўныя квіткі за 1792 і 1793 гг. аб уплаце чыншу Раймундам Паўловічам – дзедам прасіцеля з хутара Высокі Бераг Зачысцкай воласці двараніна Пятра Міхайлавіча Паўловіча [30, арк. 3 адв., 30, 31].

Цікавай з’яўляецца тая акалічнасць, што згаданыя разліковыя кніжкі *(фота 5)*, якія як па закону (пункт “в” 8-га артыкула “Положения”), так і па асабістаму меркаванню чыншавікоў разам з плацежнымі квіткамі мелі прававую моц доказаў вечначыншавых адносін, былі адабраны ў некаторых чыншавікоў аканомамі Стара-Барысаўскага маёнтка яшчэ задоўга да чыншавай рэформы. Так, жыхар засценка Стайкі Лошніцкай воласці барысаўскі мешчанін Іосіф Данілавіч Бабіцкі, звяртаючыся ў чэрвені 1887 г. у павятовую па чыншавых справах прысутнасць, абураўся: “*...за переходом имения Старий-Борисов во владение Его Императорского Высочества великого князя Николая Николаевича, управляющий имением Старий-Борисов, собирая от всех землевладельцев данные, на основании коих содержали землю, под предлогом какой-то проверки в том числе забрал и мои платежные книжки и дедовское условие, потом, задержав всё это, снабдил условиями, уверая, что это все одно и то же и что сим права наши нисколько не нарушутся, наконец оказалось, что это был обман со стороны управляющего...*” [25, арк. 7–7 адв.]. Адпаведным

чынам дзейнічалі і казённыя аканомы. У кастрычніку 1888 г. жыхар хутара Дакудава Лошніцкай воласці мешчанін Вікенцій Іванавіч Пятроўскі, звяртаючыся ў павятовую па чыншавых справах прысутнасць, тлумачыў у сваім прашэнні наступнае: *"Деды и отец мой Иван Петровский прожили по чиншевых книжках болие 76 лет, а после того прописанная земля перешла во владение казне, то от меня отнято чиншевые книжки, а дали нам условия, по которым я прожил уже, по условию, 24-е года"* [26, арк. 35]. У сакавіку 1890 г. у калектыўным апеляцыйным прашэнні ў губернскую па сялянскіх справах прысутнасць жыхары засценка Стайкі мяшчане Сцяпан Міхайлавіч Моніч, Марыя Міронаўна Бабіцкая і адстаўны радавы Фадзей Сямёнавіч Кунцэвіч пісалі: *"Предки наши жили прежде в деревни Ухолоде с давных лет на чиншевом праве, а потом перешли в хут. Стайки, которая находится в одном обрубе и одного вотчиника, от коих прежде имелось у нас чиншевые книжки, но когда имение Старо-Борисово поступило в казну, тогда чиншевые книжки были у нас отобраны..."* [22, арк. 13]. З падобным прашэннем звярнуліся ў той жа час у губернскую прысутнасць жыхары засценка Ліпкі Лошніцкай воласці дваранін Мацвей Сцяпанавіч Бабіцкі і мяшчане Ануфрый Іванавіч Даніловіч і Антон Паўлавіч Ржавускі: *"Деди и отцы наши жили с давных лет в застен[ке] Шилине, Стайки, а Ржеуский – в хуторе Голубах, а потом перешли в застен[ок] Липки, каторое находится даже в одном обрубе бывшего одного помещика, от коего прежде имели чиншевые платежные книжки, но когда имения Старо-Борисова поступила в казну, тогда у нас чиншевые книжки были отобраны, а поэтому и не могли представить письменных доказательств..."* [23, арк. 15–15 адв.].

Іншым чыншавікам ўдалося захаваць свае плацежныя кніжкі, але мясцовыя чыноўнікі ўсё роўна знаходзілі для сябе ўсялякія магчымасці праігнараваць гэтыя дакументы. Так, неадменны член Барысаўскай павятовай па чыншавых справах прысутнасці М.П. Сушкевіч, мяркуючы адмовіць жыхару хутара Маласаі І.Д. Крачкоўскаму ў атрыманні вечначыншавых правоў, тлумачыў у сваім пратаколе наступнае: *"...хотя в представленных Ильею Крачковским расписках и расчетной книжке плата и называется чиншем, но слово это в здешнем крае употребляется безразлично..."* [21, арк. 10 адв.]. Амаль той жа мовай, толькі больш разгорнута, неадменны член Сушкевіч адказваў на калектыўнае прашэнне жыхароў хутароў Млёхава і Дакудава Лошніцкай воласці агульнай колькасцю 40 чалавек: *"...в представленных некоторыми из них* (просителей. – *Ю.С.*) *расчетных книжках плата хотя и называется чиншем, но этому слову нельзя придавать того значения, как понимает его Положение о чиншевиках, так как в здешнем крае всякая плата за землю называется чиншем, как можно заключить из последующих страниц тех же книжек..."* [26, арк. 55].

Быў яшчэ адзін пункт у "Положении" (артыкул 2-гі, пункт 2-гі, падпункт "г"), спасылаючыся на які дзяржаўныя ўстановы катэгарычна адмаўлялі прасіцелям у зацвярджэнні іх у вечначыншавых правах. Справа ў тым, што сам характар чыншавага права прадугледжваў строга фіксаваны памер чыншу, а калі памер чыншу змяняўся, то такія адносіны ўжо не маглі разглядацца як вечначыншавыя [11, с. 13]. Урадавыя колы, распрацоўваючы новае заканадаўства, добра ўсведамлялі гэта. І таму, паводле менавіта такога крытэрыя, амаль ніхто з чыншавікоў Стара-Барысаўскага маёнтка не быў у стане даказаць свае "вечныя" правы на надзелы

падчас рэалізацыі чыншавай рэформы. Пасля продажу маёнтка Радзівіламі ў 1857 г. і пры далейшым знаходжанні яго як ва ўласнасці вялікіх князёў Раманавых, так і ў казённым валоданні вотчыннікі пастаянна дабіваліся ад сваіх чыншавікоў павелічэнння чыншу. І потым факт змены памеру чынша павінен быў стаць для чыншавікоў сапраўдным камнем спатыкнення на шляху іх барацьбы за свае правы. Усё гэта добра ілюструюць ужо згаданыя намі прыклады. Так, неадменны член павятовай прысутнасці М.П. Сушкевіч, адмаўляючы ў вечначыншавых правах жыхарам хутара Маласаі С.Я. Бабіцкаму, І.Д. Крачкоўскаму і М.І. Хадасевічу, адзначаў: "*...последние годы они жили по контрактам и плата менялась...*" [21, арк. 10 адв.]. У прыватнасці, С.Я. Бабіцкі і І.Д. Крачкоўскі плацілі за ўвалоку зямлі ў розны час па 20 руб., 26 руб. і 32 руб. На тую ж самую акалічнасць неадменны член зазначаў увагу 40 жыхароў хутароў Млёхава і Дакудава, у якіх на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў плата за зямлю вагалася ад 29 руб. да 41 руб.: "*...в последние годы заключались контракты и плата менялась...*" [26, арк. 55 адв.]. Тэндэнцыя павелічэння памеру чынша пры розных вотчынніках таксама добра адлюстравана ў прашэнні жыхароў вёскі Дакудава барысаўскіх мяшчан Рыгора Іванавіча Пятроўскага і Стэфана Валянцінавіча Голуба, з якім яны звярнуліся ў павятовую прысутнасць у кастрычніку 1888 г.: "*В 1820 году наши предки поселились в деревне Докудове Лошницкой волости на земле князя Радзивилы Старо-Борисовского имения, отошедшего ныне в казну. Во все время нахождения этого имения во владении г[осподина] Радзивила наши предки уплачивали ему, каждый за уволоку земли, по 15–20 руб. в год чинша и отрабатывали ему по несколько дней указанными работами. С переходом же этого имения во владение Его Императорского Высочества великого князя Николая Николаевича Старшего поденная работа прекратилась, и мы платили чинша по 32 р. в год, а теперь плотим в казну по 42 р. в год каждый чиншу же*" [26, арк. 33].

Новае чыншавае заканадаўства было распрацавана менавіта такім чынам, каб дзяржава магла як мага хутчэй вырашыць чыншавае пытанне не на карысць чыншавікоў. Нават справаводства ў новаўтвораных павятовых па чыншавых справах прысутнасцях было пастаўлена на рэйкі фарсіраванай ліквідацыі вечначыншавых адносін, што вынікае ўжо з самога факта існавання асобных тыпаграфскіх бланкаў пастаноў па заведзеных справах. Гэтыя бланкі ўтрымлівалі надрукаваны тэкст адмоўнага адказу чыншавікам і ў канчатковым выглядзе адрозніваліся толькі ўпісанымі ад рукі імёнамі прасіцелей і назвай маёнтка, дзе знаходзіліся іх зямельныя надзелы. Апошні абзац кожнай такой пастановы гаварыў: "*Уездное присутствие, находя, что приведенные [такими-то просителями] основания не служат доказательством пользования земельным[и] участк[ами] на чиншевых правах, ПОСТАНОВИЛО: ходатайство [таких-то просителей] о признании за н[ими] права на вечночиншевое владение участк[ами] земли в имении [таком-то] оставить без удовлетворения...*" [24, 2–2 адв.]. Аналагічныя бланкі выкарыстоўваліся і ў вышэйшай апеляцыйнай інстанцыі – губернскай па сялянскіх справах прысутнасці [23, арк. 1–2 адв.; 29, арк. 29–30 адв.; 30, арк. 32–33 адв.]. Мясцовыя чыноўнікі, нібы выконваючы нейкі сакрэтны загад "зверху", былі бюракратычна падрыхтаваныя да таго, каб даваць усім чыншавікам аднолькавыя – адмоўныя – адказы, на падставе якіх тыя пазбаўляліся сваіх адвечных правоў і бязлітасна зганяліся з роднай



№ 42/90.

ДѢЛО

Борисовскаго уѣзднаго по чиншевымъ дѣламъ Присутствія.

по заявленію жителей деревень Млехово и Докудово Лукашевичей Крачковских Ходасевичей и друг. въ числѣ 47 человѣкъ о признаніи за ними права на вѣчно чиншевое владѣніе земельными участками входящими въ составъ имѣнія Старый Борисовъ владѣльца принадлежащаго казнѣ

Начато 8 іюня 1887 г.
Окончено 18 г.

*Фота 6.*
*Справа Барысаўскай павятовай па чыншавых справах прысутнасці паводле прашэння 47 жыхароў вёсак Млёхава і Дакудава аб прызнанне за імі права на вечначыншавае валоданне зямельнымі ўчасткамі ў казённым маёнтку Стары Барысаў. 1887 г. (НГАБ. – Ф. 242. – Воп. 4. – Спр. 215. – Арк. 22).*

зямлі. Цынічна хутка дзяржава імкнулася расправіцца з "вечнымі арандатарамі", загадзя запасаючы стосы тыпаграфскіх бланкаў, адзіны ўжо змест якіх фактычна прадвызначаў беззямельны лёс многіх чыншавікоў Стара-Барысаўскага маёнтка.

У большасці выпадкаў землекарыстальнікі звярталіся ў чыншавыя інстанцыі самастойна, без пасрэднікаў. Але часам яны калектыўна наймалі ў якасці свайго паверанага якую-небудзь юрыдычна падкаваную асобу, каб тая паспрабавала на больш-менш якасным прававым узроўні пазмагацца (відаць, за немалыя грошы) з імперскай бюракратычнай машынай Раманавых. Менавіта так паступілі жыхары вёсак Млёхава і Дакудава (Хадасевічы, Лукашэвічы, Крачкоўскія і інш.) агульнай колькасцю звыш 40 чалавек *(фота 6)*. Спачатку, у чэрвені 1887 г., яны падалі калектыўную заяву ў павятовую па чыншавых справах прысутнасць непасрэдна ад свайго імя, падкрэсліўшы, што папярэднім вотчыннікам яны "спакон веку заўсёды плацілі чынш" [26, арк. 24–25]. Пасля таго ж, як неадменны член павятовай прысутнасці М.П. Сушкевіч, склаўшы пратакол, зрабіў папярэднюю пастанову не на карысць прасіцеляў, апошнія афармілі даверанасць на тытулярнага саветніка Андрэя Мацвеевіча Шпакоўскага з Мінска, які афіцыйна стаў "паверанымі ўсіх жыхароў вёсак Млёхава і Дакудава" і павінен

быў абараняць іх інтарэсы "ва ўсім і паўсюль" [26, арк. 9, 11 адв.]. Для чыншавікоў гэта была, канешне, безвыніковая зацея, асабліва калі ўлічваць тое, што дзяржаўныя ўстановы дзейнічалі паводле загадзя распрацаванага сцэнарыя. Тым не менш, паверany Шпакоўскі, унікнуўшы ў сутнасць справы, паспрабаваў звярнуць увагу членаў павятовай прысутнасці на некалькі істотных момантаў [26, арк. 14–14 адв.]. У прыватнасці, ён адзначаў, што зямельныя ўчасткі, якімі карысталіся яго давернікі, фактычна складаліся з дзвюх частак – з надзелаў, якімі жыхары вёсак Млёхава і Дакудава здаўна валодалі на вечначыншавым праве, і з той зямлі, якая толькі ў апошні час была ім прырэзана дзяржавай на праве тэрміновай арэнды. Атрымлівалася, што факт павелічэння памеру чынша, на які так любілі спасылацца дзяржаўныя апеляцыйныя інстанцыі, на самой справе не меў месца, бо павялічвалася толькі агульная плата за кошт прырэзанай зямлі, а казённае ўпраўленне Стара-Барысаўскага маёнтка, каб юрыдычна ператварыць вечных чыншавікоў у "часовых арандатараў", у свой час адабрала ў давернікаў Шпакоўскага чыншавыя дакументы (плацежныя кніжкі і квіткі) і замяніла іх тэрміновымі кантрактамі, тым самым хітрасцю распаўсюдзіўшы права часовай арэнды на ўсю зямлю, якая знаходзілася ў карыстанні чыншавікоў. Паверany Шпакоўскі таксама заўважыў, што подпісы пад гэтымі кантрактамі, зробленыя іншымі асобамі замест яго давернікаў як непісьменных, нікім не засведчаны і таму кантракты з'яўляюцца аднабаковымі, а гэта значыць не маюць юрыдычную моц. У сваю чаргу, павятовая прысутнасць знайшла аргумент Шпакоўскага адносна прырэзкі казённым упраўленнем дадатковай зямлі чыншавікам з павелічэннем агульнай платы дакументальна не пацверджаным, а таксама адзначыла адсутнасць жыхароў вёсак Млёхава і Дакудава ў тым спісе вечначыншавых уладальнікаў, які, паводле 38-га артыкула "Положения", быў складзены Мінскім ўпраўленнем дзяржаўнымі маёмасцямі як вотчыннікам Стара-Барысаўскага маёнтка і накіраваны ў павятовую прысутнасць [26, арк. 15–15 адв.]. Заяву ж Шпакоўскага наконт незавераных подпісаў пад тэрміновымі кантрактамі, зробленых замест яго непісьменных давернікаў, павятовая прысутнасць "выпусціла з-пад увагі" [26, арк. 10].

Чарговым крокам паверанага Шпакоўскага была падача апеляцыйнай скаргі ў губернскую па сялянскіх справах прысутнасць. Тут ён ужо даволі выразна сфармуляваў свае аргументы, сярод якіх найбольш цікавым і пераканаўчым, на наш погляд, з'яўляецца наступны. "*Управление государственными имуществами,* – пісаў Шпакоўскі, – *прибавило к каждому чиншевому участку по несколько десятин смежной земли, отчего сверх чиншевой платы, никогда не изменяемой, верители мои стали платить и за прибавленную им землю, и чрез это увеличение платы за землю уездное присутствие признало всю таковую не чиншевою, а арендною, но как по закону не на моих верителях как уверяющих, а на Управлении государственными имуществами как отрицающих лежит обязанность доказать, что изменение платы последовало не от прибавки земли, которой не было, а от усмотрения Управления, то и прописанное предположение уездного присутствия как противузаконное не может быть признано правильным*" [26, арк. 10]. Аднак гэты аргумент Шпакоўскага губернская прысутнасць расцаніла ўсяго толькі як адну з "галаслоўных заяў" [26, арк. 117]. Аднабаковасць жа тэрміновых кантрактаў з прычыны адсутнасці пад імі завераных подпісаў з боку "арандатараў" губернскае прысутнасць нібы прызнала, але пры гэтым спаслалася на тое, што яшчэ "пры праверке на месцы" першапачатко-

вых заяў неадменным членам павятовай прысутнасці самі жыхары вёсак Млёхава і Дакудава супраць гэтых кантрактаў ніякіх пярэчанняў не зрабілі [26, арк. 116 адв.]. Усе астатнія аргументы паверанага чыншавікоў губернская прысутнасць, якая, дарэчы, зрабіла сваю пастанову амаль толькі праз чатыры гады (!) пасля атрымання апеляцыі Шпакоўскага, таксама фактычна перакрэсліла. Як вынікае з дакументаў, да падачы апеляцыі ў найвышэйшую інстанцыю – Сенат – справа так і не дайшла.

Некаторыя чыншавікі апантана чапляліся за ўсялякую магчымасць дакументальна адстаяць свае правы. Так, звяртае на сябе ўвагу выпадак, калі ў канцы 1888 г. 12 жыхароў вёскі Дакудава з прозвішчам "Хадасевіч" праз паверанага са свайго жа асяроддзя двараніна Пятра Маркавіча Хадасевіча заявілі ў павятовую па чыншавых справах прысутнасць аб тым, што іх продкі трымалі ўчасткі зямлі ў вёсцы Дакудава яшчэ ў XVII ст. і што ў іх нават маецца на руках указ Сената 2-му дэпартаменту Мінскага галоўнага суда ад 13 чэрвеня 1828 г., дзе Хадасевічы ўзгадваюцца як чыншавікі Барысаўскага староства, якіх князь Радзівіл спрабаваў запрыгоніць, пачынаючы з рэвізіі 1795 г. [26, арк. 37, 46–47]. Між іншым, у гэтым указе тлумачыцца наступнае: *"...ищущие свободы Ходосевичи, всего 12 человек с семействами, начав в 1822-м году иск в Борисовском поветовом суде, в просьбах своих объясняли, что предки их были шляхтичи, владели недвижимыми имениями и отправляли разные по казенной службе должности, потом, поселясь в Борисовском старостве, принадлежащем тогда князю Огинскому, а ныне князю Радзивилу, платили за занимаемую ими землю чинш, но по присоединении того края к России князь Радзивил, записав их за собою во первую перепись, начал обращать их к повинностям, а потому просили от притязаний Радзивила их освободить <...> Поветовый суд, принимая в основание помянутые Ходасевичев документы, решением 22-го генваря 1823-го признал их шляхтичами с тем, чтоб князь Радзивилл, кроме взыскания следуемого ему за землю чинша, ни к каким повинностям их не принуждал"* [26, арк. 46–46 адв.]. Дарэчы, Сенат тады пайшоў насустрач радзівілаўскім чыншавікам, надаўшы ім *"для избрания роду жизни свободу"* [26, арк. 47]. Адстойваючы вечначыншавае права, Хадасевічы прадставілі ў павятовую прысутнасць не толькі копію згаданага ўказа, але і копіі рэвізскіх сказак за 1795, 1811, 1816, 1834 гг. [26, арк. 48–51 адв.] разам з вялікай радаводнай схемай, праўда, недатаванай [26, арк. 52 адв.–53]. У выніку, неадменнаму члену павятовай прысутнасці М.П. Сушкевічу падалося, што *"представленные Ходасевичами документы о предоставлении свободы занятий их роду к настоящему делу не относится"* [26, арк. 55]. Губернская па сялянскіх справах прысутнасць на гэты конт выразілася куды больш разважліва: *"...давностное поселение предков просителей на оспариваемых участках и переход таковых по наследству хотя и относится к признакам вечночиншевого владения, но одних этих признаков при отсутствии условий бессрочного пользования и неизменяемости платежей недостаточно для признания владения вечночиншевым"* [26, арк. 116 адв.–117].

Практычны вынік "Положения" ад 9 чэрвеня 1886 г. прадугледжваў ліквідацыю вечначыншавых адносін як такавых, і таму пытанне для саміх чыншавікоў, паводле 10-га і 13-га артыкулаў, павінна было вырашыцца адным з трох шляхоў: 1) выкупам вотчыннікам чыншавага права; 2) набыццём чыншавіком ва ўласнасць чыншавага ўчастка; 3) заменай чыншавага валодання тэрміновай арэндай [7, с. 277–278]. Аднак усё гэта тычылася толькі тых асоб, якія былі прызнаны "сельскімі вечнымі

чыншавікамі" з боку дзяржаўных інстанцый. У адваротным выпадку, згодна з пунктам VIII "Мнения Государственного Совета", зацверджанага імператарам разам з "Положением", няўдалыя чыншавікі маглі захоўваць за сабой трыманне зямельных надзелаў "на былых падставах" толькі на працягу пяці год з моманту ўступлення ў сілу адпаведнай пастановы аб непрызнанні за імі вечначыншавага права і пасля сканчэння гэтага тэрміну мелі права заставацца на займаных надзелах у выпадку пакупкі іх у вотчыннікаў ці заключэння арэндных дагавораў. Але зноў жа гаворка тут ішла менавіта пра тыя асобы, якія ў "губернях заходніх і беларускіх" ужо дагэтуль карысталіся правам бестэрміновай арэнды [7, с. 276].

Рэалізацыя чыншавай рэформы ў дачыненні да чыншавікоў Стара-Барысаўскага маёнтка фактычна ператваралася для многіх з іх у гвалтоўнае абеззямельванне, бо яны як асобы, не падпадаючыя пад катэгорыю "сельскіх вечных чыншавікоў", не мелі права ні выкупіць, ні ўжо нават заарандаваць свае зямельныя надзелы ў казны з-за таго, што, па-першае, дзяржава ўмудрылася пазбавіць іх вечначыншавых правоў шляхам пераводу на тэрміновую арэнду яшчэ задоўга да ўвядзення "Положения", а па-другое, на большасць старабарысаўскіх чыншавікоў як выхадцаў з "былой польскай шляхты" і як асобаў рыма-каталіцкага веравызнання распаўсюджвалася абмежавальнае расійскае заканадаўства.

Ва ўмовах падрыхтоўкі і правядзення чыншавай рэформы ствbooралася сітуацыя, калі чыншавым шляхціцам-каталікам Стара-Барысаўскага маёнтка ўвогуле ўжо было не выгодна быць ні дваранамі, ні мяшчанамі. Паходжанне з "польскага шляхецтва" і прыхільнасць да рыма-каталіцтва станавіліся для іх сапраўднай перашкодай у адчайнай спробе адстаяць самае галоўнае – кавалачак роднай зямлі. Яшчэ 9 лістапада 1884 г. імператар зацвердзіў палажэнне Камітэта Міністраў "Об установлении правил отдачи крестьянским обществам в аренду казенных земель без торгов" [4], якое пакінула за бортам дваран і мяшчан. Менш чым праз год, 27 жніўня 1885 г., было зацверджана і палажэнне Камітэта Міністраў "О недопущении лиц польского происхождения к содержанию казенных оброчных статей Западного края" [2], паводле якога дваране і мяшчане рыма-каталіцкага веравызнання не маглі ўжо нават арандаваць дзяржаўныя землі. Адзіным, хто тады заступіўся за гаротных старабарысаўскіх "арандатараў" перад вышэйшай губернскай уладай, быў барысаўскі павятовы маршалак Уладзімір Мацвеевіч Яргольскі, які тлумачыў, што "*оброчные земельные статьи*" па Стара-Барысаўскім маёнтку ў сваёй пераважнай большасці "*находятся в арендном содержании у местных крестьян, мещан, б[ывших] однодворцев и дворовых людей и частию у дворян (которые, собственно говоря, такие же крестьяне), как Докудов, Млехов и некоторые другие хутора*". "*Все это население,* – падкрэсліваў маршалак, – *с незапамятных времен арендует эти статьи, и он[ы]е от прадедов и дедов переходили в их наследственное пользование, которое составляет единственное для них средство к существованию, причем хлебопашество составляет исключительный их промысел и насущную заботу*" [19, арк. 10 адв.]. Добра ўсведамляючы гэтую дыскрымінацыйную і драпежніцкую тэндэнцыю ў тагачаснай расійскай заканатворчасці, барысаўскі маршалак фактычна апярэджваў беззямельны лёс многіх чыншавікоў, калі пісаў, што прымяненне новых законаў "*приведет к полному разорению несколько сотен семейств, заключающих в себе несколько тысяч душ, которые останутся без крова, земли и средств зарабо-*

*тать насущный кусок хлеба"* [19, арк. 10 адв.]. *"Кроме того,* – звяртаўся да губернатара маршалак, – *необходимо принять во внимание, что все эти тысячи фермеров или арендаторов такие же хлебопашцы, как и окрестные их соседи-крестьяне, и что они также имеют все права на заботу Правительства об их насущном хлебе"* [19, арк. 26].

У гэтай сувязі, "Положение" ад 9 чэрвеня 1886 г. – краевугольны камень чыншавай рэформы – нанесла па многіх старабарысаўскіх чыншавіках вырашальны ўдар, бо цяпер яны, пазбаўленыя вечначыншавых правоў, не маглі ўдзельнічаць у таргах на арэнду казённых зямель менавіта як "польскія шляхціцы" і каталікі. У 1888 г. некаторыя з іх звярнуліся з калектыўным прашэннем у Міністэрства ўнутраных спраў, каб тое дазволіла ім заарандаваць у Стара-Барысаўскім маёнтку зямельныя ўчасткі "з павышэннем арэнды на 10% праз кожныя 12 год" ці хаця б дапусціла іх да таргоў на арэнду гэтых участкаў [19, арк. 7]. Прашэнне было перанакіравана да мінскага губернатара, які, у выніку, цалкам пагадзіўшыся з Мінскім упраўленнем дзяржаўнымі маёмасцямі, адмовіўся зрабіць які-небудзь крок насустрач арандатарам-каталікам [19, арк. 8–9]. Нават палажэнне Камітэта Міністраў "Об условиях допущения лиц бывшей польской шляхты и мещан-католиков к арендованию казенных оброчных статей в западных губерниях" ад 20 лістапада 1887 г. [3] на практыцы не мела моцы.

З чыншавых спраў Мінскай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці вынікае, што чыншавікі Стара-Барысаўскага маёнтка высяляліся казённай адміністрацыяй раптоўна для іх, яшчэ падчас разгляду іх заяў і доказаў у апеляцыйных інстанцыях. Так, восенню 1889 г., пасля перадачы ў павятовую па чыншавых справах прысутнасць яе неадменным членам М.П. Сушкевічам справаводства, заведзенага з нагоды прашэнняў жыхароў вёсак Млёхава і Дакудава, 15 сямей жыхароў гэтых вёсак (дваране і мяшчане Лукашэвічы, Хадасевічы, Крачкоўскія і інш.) падвергліся высяленню, а іх "участкі былі аддадзены Мінскім упраўленнем дзяржаўнымі маёмасцямі з таргоў іншым асобам, бо яны, прасіцелі, як каталікі непадатковага саслоўя, не маюць па закону права на арэнду зямлі ў казённых маёнтках" [26, арк. 14, 109–109 адв.]. Подобным чынам у той жа самы час былі пазбаўлены свайго зямельнага ўчастка на хутары Ляхаўка Бытчанскай воласці дваране-каталікі Казімір і Іван Іосіфавічы Быкоўскія і Франц Валянцінавіч Драздоўскі [27, арк. 2]. Супярэчлівасць праблемы абеззямельвання чыншавікоў таксама выразна канстатуецца ў пастанове павятовай прысутнасці па справе жыхароў хутара Высокі Бераг Зачысцкай воласці двараніна Пятра Міхайлавіча Паўловіча і мешчаніна Іосіфа Стэфанавіча Цялевіча: "...*земельный участок, на который они* (П.М. Паўловіч і І.С. Цялевіч. – *Ю.С.*) *простирают свое чиншевое право, последние 24 года находился в их пользовании по срочным договорам, заключавшимся с управлением имения, в сентябре же 1889 года, за истечением срока последнего договора, участок этот, по распоряжению Минского управления государственными имуществами, был сдан в аренду с торгов, в которых они, как лица польского происхождения, лишены были права принять участие и, таким образом, в настоящее время устранены от пользования землей"* [30, арк. 3 адв., 8].

Трагедыя гвалтоўнага і драпежніцкага абеззямельвання чыншавых шляхціцаў дзяржавай яскрава прасочваецца на прыкладзе сям'і ўжо не раз згаданага намі Іллі Данілавіча Крачкоўскага з хутара Маласаі, які, заўважым, змагаўся за свае вечначыншавыя правы небеспадстаўна. Ён і яго продкі ў радзівілаўскім маёнтку



*Фота 7. Карл Іосіфавіч Свяцкі (1866–1929), уладальнік маёнтка Крупка Сенненскага павета Магілёўскай губерні з 1877 да 1918 гг. Надпіс пад фотаздымкам: "Na wycieczce: K. Świacki rok 1911" (з сямейнага альбома Свяцкіх).*

Барысаўшчына – былым Барысаўскім старостве – карысталіся зямлёй спрадвек, калі яшчэ афіцыйна належылі да шляхецкага саслоўя. Сенатам жа род Крачкоўскіх так і не быў зацверджаны ў дваранстве, і галіна Іллі Данілавіча з Маласаяў паводле ўказа Мінскай казённай палаты ад 14 студзеня 1865 г. была прылічана да "граждан горада Барысава" [33, арк. 102–102 адв.], а пазней, паводле ўказа той жа палаты ад 31 снежня 1870 г., пералічана да "мяшчан-хрысціян горада Барысава" [39, арк. 60 адв.–61]. У саслоўі барысаўскіх мяшчан прадстаўнікі гэтай галіны, увесь час пражываючы ў сельскай мясцовасці, знаходзіліся аж да 1917 г. Бацька Іллі Крачкоўскага – Данііл Ксавер'евіч – зафіксаваны ў ліку "чыншавага шляхецтва" як у рэвізскай сказцы ад 28 студзеня 1816 г., калі ён жыў яшчэ ў вёсцы Стайкі на фундушовай зямлі свя-






*Фота 8. Міхаіл Пятровіч Крачкоўскі (унук чыншавага шляхціца Іллі Данілавіча Крачкоўскага з хутара Маласаі), выпускнік Нава-Барысаўскага 4-класнага гарадскога вучылішча, 7 чэрвеня 1913 г. (з сямейнага архіва Юрыя Снапкоўскага).*

тара Верацея [36, арк. 318–319], так і ў рэвізскай сказцы за снежань 1811 г., калі ён стала жыў у вёсцы Ланкаўшчына на зямлі князя Міхаіла Радзівіла [37, арк. 24]. Нават прадзед Іллі Данілавіча – Андрэй Крачкоўскі – фігуруе як чыншавік з засценка Ланкаўшчына ў рэестре збору чыншу па Барысаўскім старостве за 1766 г. [38, арк. 17 адв.].

Такім чынам, чыншавікі Стара-Барысаўскага маёнтка яшчэ да правядзення чыншавай рэформы апынуліся ў стане часовых арандатараў і, самі таго не ўсведамляючы, заставаліся "вечнымі чыншавікамі" толькі ў сваіх марах. Дзяржава ж атрымала ў выглядзе "Положения" ад 9 чэрвеня 1886 г. моцны прававы падмурак, якім паспяхова і скарысталася, калі павысяляла напрацягу некалькі год са свайго маёнтка былых радзівілаўскіх чыншавікоў, трапіўшых у жорнаў супярэчлівага расійскага заканадаўства.

"Па выніках барацьбы за зямлю і чыншавай рэформы 1886 г., – піша В. Макарэвіч, – па чыншавіках быў нанесены значны ўдар. Вялікая колькасць іх была абеззямелена па ініцыятыве памешчыкаў, якія адстойвалі свае карпаратыўныя інтарэсы ва ўмовах нарастаючага крызісу феадальных устояў і росту коштаў на зямлю. Памешчыкі імкнуліся пазбавіцца чыншавай шляхты, пакінуўшы сабе яе надзелы, альбо павялічыць прыбыткі шляхам пераводу чыншавікоў на арэнднае трыманне зямлі"



*Фота 9. Мальвіна Пятроўна Крачкоўская (злева), унучка чыншавага шляхціца Іллі Данілавіча Крачкоўскага з хутара Маласаі, разам з невядомай (магчыма, са сваёй старэйшай сястрой Кацярынай), 1910-я гг. (з сямейнага архіва Юрыя Снапкоўскага).*

[11, с. 13]. Дадзенае сцвярджэнне, на наш погляд, справядлівае і ў дачыненні да дзяржавы як землеўладальніка, бо, па-першае, ёй самой не хацелася ўтрымліваць на сваіх тэрыторыях такую "палітычна непажаданую масу" як чыншавікі [11, с. 7], а па-другое, яна таксама жадала скарыстаць больш выгадныя ўмовы тэрміноваарэнднай сістэмы. Падзеі, звязаныя з чыншавай рэформай 1886 г., можна лічыць, з аднаго боку, "панскім разборам шляхты" [11, с. 13], а з другога – "дзяржаўным разборам чыншавікоў".

Пасля юрыдычнай ліквідацыі вечначыншавых адносін лёс былых чыншавых шляхціцаў Стара-Барысаўскага маёнтка, гвалтоўна пазбаўленых зямлі, склаўся па-рознаму. Некаторыя з іх у пачатку 1890-х гг. атабарыліся на суседніх прыватных землях буйнога памешчыка Карла Іосіфавіча Свяцкага *(фота 7)* ў маёнтку Крупка Сенненскага павета Магілёўскай губерні[2]. Пан Свяцкі тады фактычна прытуліў старабарысаўскіх выгнаннікаў, велікадушна прадставіўшы ім у арэнду сваю зямлю на даволі чалавечых умовах. Акрамя ўсялякіх акалічнасцяў, не апошнюю ролю ў гэтым выпадку, відаць, адыграла і канфесійная салідарнасць, праяўленая каталікамі-памешчыкамі Свяцкімі ў дачыненні да каталікоў-землеарандатараў, дыскрымінаваных і фактычна дэпартаваных з казённых зямель у межах рэалізацыі

[2] Барысаўскі павет Мінскай губерні на ўсходзе межаваўся з Сенненскім паветам Магілёўскай губерні. – *Аўт.*



*Фота 10. Сёстры Ангеліна, Марыя і Сафія Пятроўны Крачкоўскія (унучкі чыншавага шляхціца Іллі Данілавіча Крачкоўскага з хутара Маласаі), пачатак 1930-х гг. Надпіс на адвароце фотаздымка: "Быть может, волны жизни умчат из нас куда кого-нибудь, то остальным открытка эта пусть напомнит что-нибудь" (з сямейнага архіва Юрыя Снапкоўскага).*

чыншавай рэформы. Яскравым тут прыкладам зноў з'яўляецца лёс 70-гадовага барысаўскага мешчаніна Іллі Данілавіча Крачкоўскага, які восенню 1889 г. быў пазбаўлены спадчыннай зямлі на хутары Маласаі Лошніцкай воласці Барысаўскага павета і, у выніку, разам са сваёй вялікай сям'ёй – з дзецьмі ўнукамі *(фота 8, 9, 10)* – апынуўся ў засценку Малінаўка Бобрскай воласці Сенненскага павета, дзе стаў аднім з арандатараў зямель пана Свяцкага. Тым самым, Крачкоўскія ўвайшлі і ў лік сталых парафіянаў Бобрскага касцёла, куды больш блізкага ад іх новага месца жыхарства. Заслугоўвае ўвагі той момант, што ў землеарандатараў Крачкоўскіх склаліся добрыя адносіны не толькі з памешчыкам Карлам Свяцкім, але нават з уладарным і эксцэнтрычным аканомам яго маёнтка Крупка – Рышардам Лубай, які на зыходзе нямецкай акупацыі ў 1918 г., назаўсёды пакідаючы разам са Свяцкімі беларускія землі, пакінуў Крачкоўскім на памяць і свой фотаздымак *(фота 11)*. Вобраз спагадлівага памешчыка Свяцкага адбіўся таксама ў сямейнай памяці Крачкоўскіх.

Крыху ў іншай сітуацыі апынуліся чыншавікі праваслаўнага веравызнання, але таксама выхадцы з "былой польскай шляхты". 19 студзеня 1893 г. імператар зацвердзіў новы закон – "Положение о поземельном устройстве русских арендаторов православного исповедания, водворенных на владельческих землях в губерниях северо-западных и белорусских до 19 февраля 1861 года" [6], які натхніў некаторых "арандатараў" Стара-Барысаўскага маёнтка на чарговую хвалю бюракратычных змаганняў за зямлю. Так, у ліпені 1893 г. жыхар засценка Шыліна Лошніцкай



*Фота 11. Рышард Франц Луба, аканом маёнтка Крупка Сенненскага павета Магілёўскай губерні да 1918 г. (з сямейнага архіва Юрыя Снапкоўскага).*

воласці барысаўскі мешчанін Сцяпан Данатавіч Крачкоўскі (родны пляменнік Іллі Данілавіча Крачкоўскага з хутара Маласаі), праваслаўны па веравызнанні (бо яго маці была праваслаўная, а бацька – каталік), звярнуўся ў Барысаўскую павятовую па сялянскіх справах прысутнасць с прашэннем аб аказанні яму садзейнічання ў выкупе арандаванай зямлі [40, арк. 7]. Павятовая прысутнасць гэтае прашэнне адхіліла з фармулёўкай: *"...действие закона 19 января 1893 г. распространяется лишь на земли, арендуемые русскими арендаторами православного исповедания в имениях владельческих, но не казенных"* [40, арк. 10]. У сваю чаргу, Крачкоўскі палічыў пастанову павятовай прысутнасці цалкам несправядлівай і ў жніўні 1894 г. накіраваў апеляцыйную скаргу ў губернскую па сялянскіх справах прысутнасць з наступным тлумачэннем: *"...я и родители мои занимали и пользовались из давних времен более 50 лет застенками: Шилино, Ярцева и Добрицкий, состоящие в имении Старый Борисов, когда они принадлежали не казне, а великому князю Николаю Николаевичу, казна же приобрела имение Старый Борисов лишь недавно. Следовательно, я во владельческом имении пользовался землею до перехода имения в казну"* [40, арк. 3]. Але і губернская прысутнасць ці то па недасведчанасці сваёй, ці то наўмысна не заўважыла відавочнае, палічыўшы скаргу Крачкоўскага неабгрунтаванай, і ў красавіку 1896 г. пацвердзіла адмоўную пастанову папярэдняй інстанцыі [40, арк. 11–11 адв.]. На сутнасць новага закона чыноўнікам мясцовых інстанцый расплюшчыў вочы толькі ўказ Сената ад 29 верасня 1898 г., у якім растлумачвалася,

што маёнтак Стары Барысаў у 1861 г. знаходзіўся ў прыватным валоданні вялікага князя Мікалая Мікалаевіча Старэйшага, а паколькі закон ад 19 студзеня 1893 г. дае права выкупаць зямлю тым праваслаўным арандатарам, якія пасяліліся на прыватных землях да 19 лютага 1861 г., то пераход маёнтка з прыватнага ўладання ў казну ў пазнейшы час не можа пазбаўляць гэтых арандатараў права на пазямельнае ўладкаванне паводле разглядаемага закона [40, арк. 39 адв.].

Справа Крачкоўскага атрымала працяг ужо пры знаходжанні Стара-Барысаўскага маёнтка зноў у валоданні вялікіх князёў Раманавых, што, здавалася б, магло толькі аблегчыць выкупны працэс. У кастрычніку 1903 г. Крачкоўскі накіраваў земскаму начальніку 1-га ўчастка Барысаўскага павета прашэнне аб прызнанні за ім права выкупа 39 дзесяцін зямлі на хутары Шыліна [40, арк. 26–27]. Усе доказы прасіцеля земскі начальнік прызнаў справядлівымі, аднак падчас дэталёвага разгляду справы выявіўся новы камень спатыкнення для Крачкоўскага [40, арк. 39–40]. З прадстаўленага ім метрычнага выпіса аб яго нараджэнні і хрышчэнні ў 1847 г. у Лошніцкай царкве вынікала, што ён, сапраўды, праваслаўнага веравызнання, але сын “двараніна” [40, арк. 37 адв.–38]. Менавіта прыналежнасць Крачкоўскага да дваранства, якога ў свой час так дамагаліся яго продкі, цяпер павінна была пазбавіць яго магчымасці стаць землеўладальнікам, бо, паводле 1-га артыкула “Положения” ад 19 студзеня 1893 г., права выкупаць арандаваную зямлю надавалася толькі “праваслаўным мяшчанам і асобам сельскага стану” [6, с. 23]. Земскі начальнік не прыняў да ўвагі тую акалічнасць, што яго прасіцель на той момант афіцыйна лічыўся ўжо барысаўскім мешчанінам, а ўвесь род Крачкоўскіх не быў зацверджаны ў дваранстве Сенатам. Таму ў лютым 1904 г. Крачкоўскі падаў у Барысаўскі павятовы з’езд апеляцыйную скаргу, у якой, “адракаючыся” ад свайго дваранства, тлумачыў: *“...отец мой в дворянском достоинстве утвержден не был, о чем представлю документальные доказательства к разбору дела в уездном съезде; в метрической же записи о моем рождении и крещении в отношении звания вкралась ошибка, хотя метрика не может служить доказательством происхождения, а лишь доказывает время рождения и крещения известного лица”* [40, арк. 45].

У той жа час пачаў дзейнічаць яшчэ адзін новы закон – “Положение о поземельном устройстве бывших вольных людей второго разряда в Минской губернии” ад 17 сакавіка 1903 г. [5], якім Крачкоўскі таксама вырашыў скарыстацца, калі ў сакавіку 1904 г. праз свайго паверанага Ануфрыя Іванавіча Шацілу зноў звярнуўся да земскага начальніка з прашэннем аб выкупе арандаванай зямлі ва ўласнасць [41, арк. 79–79 адв.]. “Положение” распаўсюджвалася на тых прадстаўнікоў насельніцтва, якія самі ці ў асобе сваіх продкаў знаходзіліся ў скасаваным саслоўі вольных людзей альбо былі прылічаны да яго ў Мінскай губерні раней за 20 лістапада 1857 г. і атабарыліся на арандаванай зямлі ў прыватнаўласніцкіх маёнтках да 25 ліпеня 1864 г. Барысаўскі мешчанін Крачкоўскі цалкам падыходзіў пад гэты новы закон, а таму меў поўнае права на выкуп зямлі з садзейнічаннем Ураду.

Такім чынам, склалася супярэчлівая сітуацыя, калі Крачкоўскі спрабаваў выкупіць зямлю ў Стара-Барысаўскім маёнтку адначасова па двух законах – “Положению” ад 19 студзеня 1893 г. і “Положению” ад 17 сакавіка 1903 г. Не дачакаўшыся вырашэння пытання па другому закону, ён у траўні 1904 г. падаў апеляцыйную скаргу ў Мінскую губернскую прысутнасць на пастанову павятовага з’езда, які

несправядліва прызнаў яго прапусціўшым тэрмін падачы заявы аб выкупе зямлі [40, арк. 16–16 адв.]. Пакуль разгляд спраў Крачкоўскага цягнуўся ў дзяржаўных інстанцыях, адміністрацыя Стара-Барысаўскага маёнтка, не жадаючы аддаваць свае землі на выкуп, пачала ўціскаць Крачкоўскага і патрабаваць ад яго высяленне з арандаваных зямель. Тады ў кастрычніку 1904 г. ён звярнуўся да мінскага губернатара з прашэннем паскорыць справаводства па першаму закону [40, арк. 18]. Але справа па другому закону вырашылася хутчэй, калі ў траўні 1905 г. павятовы з'езд зрабіў пастанову, паводле якой за Крачкоўскім як прыналежным да катэгорыі былых вольных людзей 2-га разраду было прызнана права выкупу арандаваных участкаў зямлі на хутары Шыліна. Адміністрацыя жа Стара-Барысаўскага маёнтка, упарта не пагаджаючыся з намаганнямі Крачкоўскага, у асобе свайго паверанага Нісона Мазо падала скаргу на пастанову павятовага з'езда ў Мінскую губернскую прысутнасць, якая, у сваю чаргу, у снежні 1905 г. пакінула гэтую скаргу "без наступстваў". Апеляцыя паверанага Мазо ў Сенат таксама не дала ніякіх вынікаў, бо ў гэтым выпадку вышэйшы дзяржаўны орган пайшоў насустрач выхадцу з "былой польскай шляхты" Крачкоўскаму, калі сваім указам ад 7 лістапада 1906 г. замацаваў за ім выкупное права паводле закона ад 17 сакавіка 1903 г. [41, арк. 5–5 адв., 25–25 адв.]. Таму далейшы разгляд апеляцыі Крачкоўскага яшчэ за травень 1904 г. стаў бессэнсоўным, і журнальнай пастановай Мінскай губернскай прысутнасці ад 25 кастрычніка 1907 г. яго першая выкупная справа была спынена [40, арк. 20–20 адв.].

У снежні 1912 г. Дэпартамент акладных збораў Міністэрства фінансаў за прадстаўленую "вольнаму чалавеку" Стэфану Данатавічу Крачкоўскаму на выкуп зямлю ў засценку Шыліна колькасцю 32 дзесяціны 1584 сажні дазволіў выкупную пазыку ў памеры 1583 руб. 33 кап., на пагашэнне якой Крачкоўскі быў абавязаны штогод уносіць у казну выкупныя плацяжы на працягу 49 год, пачынаючы з 1 жніўня 1911 г. [41, арк. 47].

Як бачна з пададзенага прыклада, для некаторых катэгорый былых чыншавых шляхціцаў змаганні за спадчынную зямлю ва ўмовах адносна спрыяльнага заканадаўства пачатку XX ст. скончыліся ўсё ж на іх карысць. Аднак, трэба заўважыць, набыццё ўласнай зямлі ў той жа час каштавала ім згубленнем некаторай саслоўнай карпаратыўнасці, бо, ператвораныя ў агульную масу "былых вольных людзей", яны, паводле 17-га артыкула "Положения" ад 17 сакавіка 1903 г., павінны былі прылічыцца да адпаведных валасцей ці нават стварыць асобныя сельскія таварыствы згодна "Общему положению о крестьянах, вышедших из крепостной зависимости" [5, с. 160]. Тое, што не змагла зрабіць чыншавая рэформа 1886 г. у адным са сваіх аспектаў (27-мы артыкул "Положения"), у пэўнай ступені рэалізаваў закон ад 17 сакавіка 1903 г. "Улады ж, – піша В. Макарэвіч пра чыншавую рэформу, – вымушалі былых шляхціцаў не толькі да змены саслоўнай прыналежнасці, але і да інтэграцыі ў сялянскае асяроддзе, што ў рэшце рэшт павінна было прывесці да страты дробнай шляхтай сваёй этна-культурнай адметнасці" [11, с. 11].

Сярод наступстваў чыншавай рэформы, хоць і не прамых, але хутчэй ускосных, можна таксама адзначыць ператварэнне некаторых чыншавых шляхціцаў як дэкласаванай і збяднелай групы насельніцтва ў крыніцу папаўнення новых класаў, у прыватнасці, пралетарыяту. Як адзначае беларускі гісторык Андрэй Кіштымаў, "у цэлым удзел у фарміраванні беларускага пралетарыяту прымалі ўсе саслоўі, не вы-

ключаючы дваран і іншаземцаў" [9, с. 211]. Паказальным прыкладам адной з такіх сацыяльных метамарфозаў з'яўляецца лёс дзяцей халапеніцкага мешчаніна (раней – двараніна) Антона Мацвеевіча Бабіцкага з засценку Восаў-Нацкі Лошніцкай воласці, былога радзівілаўскага чыншавіка. Яго старэйшы сын Дамінік у віхру працоўнага жыцця апынуўся ў мястэчку Крупка Сенненскага павета і ўжо ў даволі сталым узросце (амаль 55 год) быў зафіксаваны ў сельскагаспадарчым перапісе ад 1 студзеня 1925 г. як "рабочы фабрыкі" [12, арк. 37 адв., № 205], а малодшы сын Віктар яшчэ да пачатку Першай сусветнай вайны трапіў у мястэчка Шклоў Магілёўскага павета і ў тым жа перапісе фігуруе як рабочы шклоўскай фабрыкі "Барацьба" [13, арк. 135 адв., № 26]. У перапісе ад 1 студзеня 1925 г. па мястэчку Крупка ўзгадваюцца і іншыя выхадцы з чыншавага шляхецтва: Уладзіслаў Францавіч Рэвут, Іосіф Сцяпанавіч Пётух, Фама Вікенцьевіч Бабіцкі, Іван Іванавіч Кунцэвіч і Раман Васільевіч Бабіцкі – як "чарнарабочыя" [12, арк. 35 адв.–37, № 99, 100, 171, 177, 196], Адэлаіда Іосіфаўна Пётух – як "рабочы ганчарнага заводу" [12, арк. 36 адв., № 172], Антон Восіпавіч Бабіцкі – як "рабочы фабрыкі" [12, арк. 37 адв., № 226], Іван Васільевіч Бабіцкі – як "пастух" [12, арк. 40 адв., № 341]. На станцыі "Крупкі" жылі і працавалі "чарнарабочыя" Антон Феліксавіч Бабіцкі і Ефрасіння Сідараўна Бабіцкая [12, арк. 42–42 адв., № 26, 42]. У чыгуначнай будцы № 407 Крупскага сельсавета жыў з сям'ёй Іван Стэфанавіч Крачкоўскі – "рамонтны рабочы чыгункі" [12, арк. 46 адв., № 1]. Далёка не ўсе названыя асобы мелі ў карыстанні зямельны надзел і таму вымушаны былі жыць на здымных кватэрах.

Зрэшты, рэвалюцыя 1917 г., ліквідаваўшы саслоўнасць як такавую, хоць і паклала канец многім сацыяльна-прававым абмежаванням, але ў недалёкай будучыні прымусіла асяляненых і апралетарызаваных шляхціцаў устаць на новы шлях змагання – ужо не столькі за зямлю, колькі за само фізічнае існаванне ва ўмовах барацьбы савецкай дзяржавы з "унутраным ворагам".

* * *

У 1920–1930-я гг. беларускія хутары і засценкі, значную частку якіх складалі былыя старажытныя шляхецкія ваколіцы, уяўлялі сабой цэлыя астраўкі свабоднага жыцця сярод бушуючага мора савецкага таталітарнага рэжыму. Аднак дзяржаўная праграма "па ссяленню хутароў у калгасныя цэнтры", паспяхова рэалізаваная падчас другой і трэцяй "пяцігодак", стала магутным паскаральнікам гэтага працэсу дэмаралізацыі і акалгашвання дэкласаванай шляхты, у выніку чаго многія нашчадкі дробных шляхецкіх родаў былі інтэграваны ў новы саслоўны тып "казённых сялян", як іранічна, але трапна ахарактарызаваў савецкіх калгаснікаў рэдактар рускага перакладу ўспамінаў вядомага памешчыка-эмігранта [1]. У гэтым сэнсе таксама цікавыя разважанні аднаго старажыла з Крупшчыны: "У 1939-м пачалі ссяляць хутары; савецкая ўлада ўвесь час думала над тым, як яшчэ ашчасліваць людзей. Надумаўшы, што на хутарах ім можа быць адзінока, і далёка ад шчаслівага калгаснага ладу – прынялі нейкі ўказ, па якім паселішча меней за 10 хат падлагала зносу. Як заўсёды,

*Фота 12 (с. 227). Выхадцы з чыншавага шляхецтва, пачатак XX ст. (з сямейнага архіва Валянціны Бабіцкай). Калі хтосьці з чытачоў пазнае на гэтым фотаздымку сваіх продкаў ці сваякоў, просьба звязацца з рэдакцыяй*



мясцовыя ўлады перавыканалі план. У нашых Навасёлках было 12 хат, тым не менш іх знеслі. Далі тэрмін на перавозку хат, а не, – дык раскідаем. Усю зямлю забралі, а саміх у калгас" [44, с. 368].

Як вынік, нашчадкі дробных шляхціцаў сёння цалкам асіміляваныя з нашчадкамі выхадцаў з усіх магчымых іншых саслоўяў і не вылучаюцца з усёй масы беларускага народу ні на ўзроўні менталітэта, ні, тым больш, на ўзроўні сацыяльна-прававога становішча *(фота 12).* Аб былым шляхецтве іх продкаў, у большасці выпадкаў, сведчаць толькі іх "польскія" прозвішчы (Бабіцкія, Крачкоўскія, Ржавускія, Закрэўскія, Драздоўскія, Пятроўскія, Клячкоўскія, Бужымскія, Гіро, Пётухі, Францкевічы і інш.) і эпізадычныя ўзгадкі сучаснікаў у прыватных размовах накшталт: "Памятую, маці мая казала, што мы – з шляхты…". Людзі старэйшых пакаленняў часам нават узгадваюць сямейныя размовы пра родавы герб.

Савецкія палітычныя эксперыментатары, перакрэсліўшы мінулае і зруйноўваючы могілкі, фанатычна імкнуліся стварыць новы тып чалавека – "homo soveticus" – чалавека з шаблонным мысленнем, чалавека без радаводу, без каранёў, без мінулага, чалавека, у якога ёсць толькі ўтапічная будучыня. Але чым больш зазіраеш у мінулае, тым больш разумееш, што жыццё заўсёды бярэ сваё і не можа змясціцца ў пракруставым ложы ідэалагічных сурагатаў. І шлях да новай ідэнтычнасці, у самым шырокім сэнсе гэтага слова, ляжыць зараз, як нам падаецца, менавіта праз спасціжэнне мінулага – мінулага асобнага чалавека, сям'і, роду, Айчыны, бо мінулае, сучаснае і будучае з'ядноўваюцца ў метафізічнай плоскасці – там, дзе частка чалавека заўсёды невынішчальна існуе.

---


1. Врангель-Рокассовский К. Перед бурей. Настоящая картина жизни в России перед коммунистической революцией 1917 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.zarubezhom.com/wrangell1.htm. – Дата доступа: 30.01.2015.
2. Высочайше утвержденное Положение Комитета Министров о недопущении лиц польского происхождения к содержанию казенных оброчных статей Западного края. 27 августа 1885 г. // Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 3. – СПб.: Государственная типография, 1887. – Т. V. – № 3173. – С. 404.
3. Высочайше утвержденное Положение Комитета Министров об условиях допущения лиц бывшей польской шляхты и мещан-католиков к арендованию казенных оброчных статей в западных губерниях. 20 ноября 1887 г. // Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 3. – СПб.: Государственная типография, 1889. – Т. VII. – № 4814. – С. 460–461.
4. Высочайше утвержденное Положение Комитета Министров об установлении правил отдачи крестьянским обществам в аренду казенных земель без торгов. 9 ноября 1884 г. // Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 3. – СПб.: Государственная типография, 1887. – Т. IV. – № 2488. – С. 515–516.
5. Высочайше утвержденное Положение о поземельном устройстве бывших вольных людей второго разряда в Минской губернии. 17 марта 1903 г. // Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 3. – СПб.: Государственная типография, 1905. – Т. XXIII. – № 22664. – С. 157–160.

6. Высочайше утвержденное Положение о поземельном устройстве русских арендаторов православного исповедания, водворенных на владельческих землях в губерниях северо-западных и белорусских до 19 февраля 1861 года. 19 января 1893 г. // Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 3. – СПб.: Государственная типография, 1897. – Т. XIII. – № 9261. – С. 23–26.
7. Высочайше утвержденное Положение о поземельном устройстве сельских вечных чиншевиков в губерниях западных и белорусских. 9 июня 1886 г. // Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 3. – СПб.: Государственная типография, 1888. – Т. VI. – № 3789. – С. 275–283.
8. Исторический обзор деятельности Комитета Министров / Сост. С.М. Середонин. – СПб.: Государственная типография, 1902. – Т. 2, ч. 1: Комитет Министров в царствование императора Николая Первого (1825 г. ноября 20 – 1855 г. февраля 18). – 390 с.
9. Кіштымаў А. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства пад уплывам развіцця прамысловасці, транспарту, гандлю // Гісторыя Беларусі: У 6 т. / Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч і інш. – Мінск: “Экаперспектыва”, 2005. – Раздзел 2. – Глава 2.3. – С. 210–216.
10. Макарэвіч В.С. Дробная шляхта Беларусі ў 30–60-я гг. XIX ст.: склад і эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча. Дыс. … канд. гіст. навук. – Мінск, 2008. – 158 с.
11. Макарэвіч В. “Панскі разбор шляхты”: абеззямельванне чыншавікоў у другой палове XIX ст. і чыншавая рэформа 1886 г. у Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2011. – № 4. – С. 3–14.
12. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 30 (Цэнтральнае статыстычнае ўпраўленне БССР). – Воп. 2. – Спр. 1449. Спісы гаспадарак Крупскага раёна Барысаўскай акругі на 01.01.1925 з кароткімі звесткамі аб іх. – 186 арк.
13. НАРБ. – Ф. 30. – Воп. 2. – Спр. 1506. Спісы гаспадарак Шклоўскага раёна Магілёўскай акругі на 01.01.1925 з кароткімі звесткамі аб іх. – 136 арк.
14. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 27 (Мінскае ўпраўленне земляробства і дзяржаўных маёмасцяў). – Воп. 2: 1867–1918 гг. – Т. 1. – 284 арк.
15. НГАБ. – Ф. 27. – Воп. 2. – Спр. 1279. Справа аб здачы ў арэнду з 01.07.1878 да 01.07.1890 барысаўскаму мешчаніну І.Д. Крачкоўскаму ўчастка зямлі на хутары Маласаі маёнтка Стары Барысаў Барысаўскага павета (08.10.1878–03.08.1892). – 12 арк.
16. НГАБ. – Ф. 27. – Воп. 2. – Спр. 2906. Справа аб перадачы ва ўласнасць вялікім князям П.М. і М.М. Раманавым маёнтка Стары Барысаў Барысаўскага павета (10.12.1898–10.09.1901). – 438 арк.
17. НГАБ. – Ф. 147 (Мінская злучаная палата крымінальнага і грамадзянскага суда). – Воп. 3. – Спр. 16357. Справа аб заключэнні купчай крэпасці паміж вялікім князем Мікалаем Мікалаевічам Старэйшым і Міністэрствам дзяржаўных маёмасцяў на маёнтак Стары Барысаў Барысаўскага павета (26.04.1876–13.11.1879). – 28 арк.
18. НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 3. – Спр. 16358. Справа аб увядзенні ў валоданне маёнткам Стары Барысаў Барысаўскага павета Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў

(27.04.1876–20.05.1876). – 6 арк.
19. НГАБ. – Ф. 242 (Мінская губернская па сялянскіх справах прысутнасць). – Воп. 3. – Спр. 1188. Справа па хадайніцтву вольных жыхароў казённага маёнтка Стары Барысаў Барысаўскага павета Р. Марцінкевіча, Ф. Ліпніцкага, І. Ржавускага, І. Рэвута, С. Марцінкевіча, П. Бабіцкага і іншых аб здачы ім у арэнду зямельных участкаў без таргоў (11.03.1885–28.06.1889). – 28 арк.
20. НГАБ. – Ф. 242. – Воп. 4: Чыншавае аддзяленне. – 100 арк.
21. НГАБ. – Ф. 242. – Воп. 4. – Спр. 191. Справа паводле скаргі мешчаніна І.Д. Крачкоўскага на непрызнанне за ім, дваранінам С.Я. Бабіцкім і мешчанінам М.І. Хадасевічам Барысаўскай павятовай па чыншавых справах прысутнасцю права на вечначыншавае валоданне зямельнымі ўчасткамі ў вёсцы Маласаі Лошніцкай воласці казённага маёнтка Стары Барысаў (01.07.1850–04.12.1892). – 29 арк.
22. НГАБ. – Ф. 242. – Воп. 4. – Спр. 196. Справа паводле скаргі мяшчан С.М. Моніча, М.М. Бабіцкай і адстаўнога радавога Ф.С. Кунцэвіча на непрызнанне за імі Барысаўскай павятовай па чыншавых справах прысутнасцю права на вечначыншавае валоданне зямельнымі ўчасткамі ў засценку Стайкі Лошніцкай воласці казённага маёнтка Стары Барысаў (20.06.1887–04.05.1899). – 28 арк.
23. НГАБ. – Ф. 242. – Воп. 4. – Спр. 197. Справа паводле скаргі двараніна М.С. Бабіцкага, мяшчан А.І. Даніловіча і А.П. Ржавускага на непрызнанне за імі Барысаўскай павятовай па чыншавых справах прысутнасцю права на вечначыншавае валоданне зямельнымі ўчасткамі ў засценку Ліпкі Лошніцкай воласці казённага маёнтка Стары Барысаў (20.06.1887–27.07.1893). – 32 арк.
24. НГАБ. – Ф. 242. – Воп. 4. – Спр. 202. Справа паводле скаргі халапеніцкага мешчаніна І.М. Бабіцкага і селяніна В.М. Судніка на непрызнанне за імі Барысаўскай павятовай па чыншавых справах прысутнасцю права на вечначыншавае валоданне зямельнымі ўчасткамі ў засценку Восаў Лошніцкай воласці казённага маёнтка Стары Барысаў (19.04.1890–20.12.1891). – 13 арк.
25. НГАБ. – Ф. 242. – Воп. 4. – Спр. 209. Справа паводле скаргі барысаўскага мешчаніна І.Д. Бабіцкага на непрызнанне за ім Барысаўскай павятовай па чыншавых справах прысутнасцю права на вечначыншавае валоданне зямельным участкам у засценку Стайкі Лошніцкай воласці казённага маёнтка Стары Барысаў (11.06.1887–25.09.1893). – 21 арк.
26. НГАБ. – Ф. 242. – Воп. 4. – Спр. 215. Справа паводле скаргі жыхароў вёсак Млёхава і Дакудава Лошніцкай воласці Хадасевічаў, Лукашэвічаў, Берднікавых, Крачкоўскіх, Клімковічаў, Бабіцкіх, Клячкоўскіх, Пятроўскіх і Голубаў на непрызнанне за імі Барысаўскай павятовай па чыншавых справах прысутнасцю права на вечначыншавае валоданне зямельнымі ўчасткамі ў казённым маёнтку Стары Барысаў (04.06.1890–29.11.1894). – 122 арк.
27. НГАБ. – Ф. 242. – Воп. 4. – Спр. 220. Справа паводле скаргі дваран К.І. Быкоўскага, І.І. Быкоўскага і Ф.В. Драздоўскага на непрызнанне за імі Барысаўскай павятовай па чыншавых справах прысутнасцю права на вечначыншавае валоданне зямельнымі ўчасткамі на хутары Ляхаўка Бытчанскай воласці казённага маёнтка Стары Барысаў (20.04.1890–20.12.1890). – 16 арк.
28. НГАБ. – Ф. 242. – Воп. 4. – Спр. 223. Справа паводле скаргі жыхара хутара Царскія Вараты Зачысцкай воласці двараніна А.Я. Бабіцкага на непрызнан-

не за ім Барысаўскай павятовай па чыншавых справах прысутнасцю права на вечначыншавае валоданне зямельным участкам у вёсцы Навасёлкі Лошніцкай воласці казённага маёнтка Стары Барысаў (12.04.1890–27.11.1891). – 25 арк.
29. НГАБ. – Ф. 242. – Воп. 4. – Спр. 225. Справа паводле скаргі дваран Ф.М. Марцінкевіча, В.М. Марцінкевіча і селяніна Д.І. Марцінкевіча на непрызнанне за імі Барысаўскай павятовай па чыншавых справах прысутнасцю права на вечначыншавае валоданне зямельнымі ўчасткамі на хутары Крыштопаўшчына Лошніцкай воласці казённага маёнтка Стары Барысаў (1826–17.12.1891). – 31 арк.
30. НГАБ. – Ф. 242. – Воп. 4. – Спр. 230. Справа паводле скаргі двараніна П.М. Паўловіча і мешчаніна І.С. Цялевіча на непрызнанне за імі Барысаўскай павятовай па чыншавых справах прысутнасцю права на вечначыншавае валоданне зямельнымі ўчасткамі на хутары Высокі Бераг казённага маёнтка Стары Барысаў (1792–24.10.1892). – 33 арк.
31. НГАБ. – Ф. 319 (Мінскі дваранскі дэпутацкі сход). – Воп. 1. – Спр. 210. Пасямейныя спісы дваран Барысаўскага павета за 1834 г. – 124 арк.
32. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 1136. Пасямейныя спісы шляхты Барысаўскага павета [за 1802 г.] (польск.). – 64 арк.
33. НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 1639. Справа аб дваранскім паходжанні роду Крачкоўскіх (13.12.1818). – 247 арк.
34. НГАБ. – Ф. 320 (Канцылярыя мінскага губернскага маршалка). – Воп. 2. – Спр. 38. Ведамасць аб чыншавай шляхце Барысаўскага павета, якая жыве на землях памешчыкаў, за 1829 г. (А–Я). – 95 арк.
35. НГАБ. – Ф. 333 (Мінская казённая палата). – Воп. 4. – Спр. 2976. Справа паводле адносіны Санкт-Пецярбургскай палаты грамадзянскага суда аб пералічэнні на імя вялікага князя Мікалая Мікалаевіча Старэйшага маёнткаў Барысаўскага павета князя Л.Л. Радзівіла (30.04.1857–26.04.1858). – 36 арк.
36. НГАБ. – Ф. 333. – Воп. 9. – Спр. 82. Рэвізскія сказкі шляхты і памешчыцкіх сялян Барысаўскага павета за 1816 г. – 3394 арк.
37. НГАБ. – Ф. 333. – Воп. 9. – Спр. 202. Рэвізскія сказкі шляхты Барысаўскага павета за 1811 г. – 203 арк.
38. НГАБ. – Ф. 694 (Радзівілы, князі). – Воп. 2. – Спр. 513. Рэестр збору чыншу па Барысаўскім старостве за 1766 г. (польск.). – 40 арк.
39. НГАБ. – Ф. 1492 (Барысаўская павятовая рэкруцкая прысутнасць). – Воп. 1. – Спр. 65. Чарговы рэкруцкі спіс мяшчан-хрысціян горада Барысава за 1871 г. – 76 арк.
40. НГАБ. – Ф. 1595 (Мінская губернская прысутнасць). – Воп. 2. – Спр. 2941. Справа паводле прашэння С.Д. Крачкоўскага аб выкупе арандаванай зямлі ў засценку Шыліна Лошніцкай воласці маёнтка Стары Барысаў вялікіх князёў М.М. і П.М. Раманавых (29.07.1893–22.12.1907). – 54 арк.
41. НГАБ. – Ф. 1595. – Воп. 2. – Спр. 4168. Справа аб выкупе барысаўскім мешчанінам С.Д. Крачкоўскім участка зямлі ў засценку Шыліна Лошніцкай воласці маёнтка Стары Барысаў вялікіх князёў М.М. і П.М. Раманавых паводле закона 17 сакавіка 1903 г. (22.12.1864–06.11.1914). – 174 арк.
42. Селицкий А.И. Польская шляхта в социально-правовой системе Российской империи // Поляки в России: XVII–XX вв. Материалы Международной научной

конференции (Краснодар, 10–11 июля 2002 г.) / Науч. ред. и сост. А.И. Селицкий. – Краснодар: "Кубанькино", 2003. – С. 105–128.

43. Сыракомля У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: Успаміны, даследаванні гісторыі і звычаяў / Пер. з польск. К. Цвіркі. – Мінск: "Полымя", 1992. – 160 с.
44. Хроніка палітычнага тэрору: 1918–2008. Крупскі рэгіён – Малое Палессе – Друцка-Бярэзінскі край. Рэгіянальны краязнаўча-энцыклапедычны даведнік / Аўт.-уклад. А. Аляхновіч; рэд. С. Дубавец. – Крупкі, 2014. – 504 с.